
IDW
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
#6 • $3.99 • CVR B
EASTMAN
WALTZ
DUNCAN









ВЫ ТОЛЬКІ ПАГЛЯДЗІЦЕ НА ІХ...


...ДЫ Й ШТО ЯНЫ ЗАДУМВАЮЦЬ, ПА-ВАШАМУ?
НУ, У ТАКІМ ПРЫКІДЗЕ, ДЫ ЯШЧЭ І ЎЗБРОЕНЫЯ ДА ЗУБОЎ... НЯ ТРЭБА БЫЦЬ ГЕНІЯМ, КАБ ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО НІЧОГА ДОБРАГА.
ГЫ, ТОЛЬКІ ГЕНІЙ МАЕ ЗВЫЧКУ РЭГУЛЯРНА НАГАДВАЦЬ АТАЧАЛЬНЫМ, ШТО ЁН ГЕНІЙ.


ЗНОЎ...
ТЫ ШТОСЬЦІ СКАЗАЎ, ЛЕА?
НІЧОГА, ГЕНІЙ.
ДАВАЙЦЕ, ХЛОПЦЫ...


ЗІРНЁМ НА ГЭТЫХ БАНДЫТАЎ БЛІЖЭЙ...


ГЭЙ, ГЭТА ЗУСІМ НЕ ГЭТАК.
У МЯНЕ НЯМА ЗВЫЧКІ ЎВЕСЬ ЧАС МУДРАГЕЛІЦЬ.
НЯЎЖО? ТАДЫ ЯК ТЫ ГЭТА ЗАВАЕШ?
ЗАВУ ШТО?
ГЭЙ, МОЗГ І НАТС – МЕНЬШ РАЗМОЎ...


...БОЛЬШ ДЗЕЯННЯ...
АГА...
...САПРАЎ-ДЫ.







ВЕДАЮ, ВЕДАЮ, БРАТОК – БЕЗ ТРЭНІРОВАК НІКУДЫ.

ГЭЙ, ХЛОПЦЫ, СПЫНІЦІСЯ!

ЯНЫ БЯГУЦЬ ПРАМА Ў ТОЙ ПРАВУЛАК!

ТАК ВОСЬ У ЧЫМ СПРАВА – ЯНЫ НЕКАГА ПЕРАСЛЕДУЮЦЬ!

ЛІХА ЯГО БЯРЭ...





ПАРКУР. ГЭТА ПА-ФРАНЦУЗСКУ. РУХ, ЯКІ ДАЗВАЛЯЕ ПЕРАСОЎВАЦЦА ПА ВУЛІЦАХ ХУТКА І СПРЫТНА ПЕРА-АДОЛЬВАЮЧЫ ЎСЕ ПЕРАШКОДЫ.

МЕНАВІТА.

ВЫДАТНА... ВЫ ЎДВАІХ, НАРЭШЦЕ, ХОЦЬ У НЕЧЫМ ЗГОДНЫ. АЛЕ ЧАМУ ГЭТЫ ПАР... ПАРК... ФРАНЦУЗ-ГІМНАСТ БЯЖЫЦЬ АД ГЭТЫХ НІНЗЯ?







ПАЧНЕМ!
АДЗІНАЕ, ШТО Я ВЕДАЮ ПА ФРАНЦУЗСКІ, ГЭТА БУЛЬБА ФРЫ, АЛЕ МНЕ І ТАК ЗРАЗУМЕЛА, ШТО ТУТ НАСПЯВАЕ НЯРОЎНАЯ СУТЫЧКА.
НЕ, РАФ... СПАКАЙНЕЙ. МАЙСТАР СПЛІНТЭР ПРАСІЎ НАС НЕ ВЫЛАЗІЦЬ БЕЗ НЕАБХОДНАСЦІ.
СПЛІНТЭРА ТУТ НЯМА.
ЗАТОЕ Я ТУТ, І Я КАЖУ – ТОЛЬКІ НАЗІРАЕМ.






РАГХ!


ЗАНАДТА ПАВОЛЬНА!
ГРРАХХ!


ВОСЬ ГЭТА ДЫК...


А НУ ПРЭЧ!


МАЯ ЧАРГА.


FWAK
ДОБРА...


...У ВАС.


ЙААРГХ!


ЗАГІНЬ.
Г-ГХРЛГ...


З МЯНЕ ХОПІЦЬ!
РАФ, СПЫНІСЯ!


РАБІ, ШТО ПАЖАДАЕШ, ЧУВАК. АЛЕ Я МАЮ НАМЕР ЗРАЎНЯЦЬ...

FWOOMP

УХ. ГРАНАТА НІНЗЯ.
ВА...
ХЛОПЦЫ! ЁН ЯШЧЭ ЖЫВЫ!
Д'ЯБЛ! КУДЫ ЯНЫ ЗНІКЛІ?









"ВЫ КАЛІ-НЕБУДЗЬ ГРАЛІ Ў БЕЙСБОЛ, МІСТЭР НЯЧЫСЦІК?"

БЕЙС... ШТО?

АХ ТАК, УВЕСЬ ЧАС ЗАБЫВАЮ, ШТО ТОЛЬКІ НЯДАЎНА ДАЛУЧЫЛІСЯ ДА ШЭРАГАЎ ПРОСТАХОДНЫХ І РАЗУМОВЫХ. ЗДАЕЦЦА, АДЗІНАЯ РЭЧ, З ЯКОЙ ВАМ, МЯРКУЮЧЫ ПА ЎСІМ, ПРЫХОДЗІЛАСЯ ПАГУЛЯЦЬ, ГЭТА КЛУБОК НІТАК.

ДЫ ВЕДАЮ Я, ШТО ТАКОЕ БЕЙСБОЛ - Я НЕ ТУПЫ. НАВОШТА ТЫ ХІЛІШ, СТОКМАН?

Я ДА ТАГО, ШТО ПА ПРАВІЛАХ БЕЙСБОЛА ГУЛЬЦУ ДАЕЦЦА ТРЫ СПРОБЫ НА ЎДАР, ПЕРШ ЧЫМ ЁН ВЫБЫВАЕ.

ВЫ ЖА, МІСТЭР НЯЧЫСЦІК, УЖО СПРАБАВАЛІ ПЕРАМАГЧЫ ПАЦУКА І ЯГО РЭПТЫЛІЙ ДВОЙЧЫ. І АБОДВА РАЗЫ, СМЕЮ ЗАЎВАЖЫЦЬ, ВЫ ПРАМАХНУЛІСЯ.

А ЦЯПЕР У ВАС, ВІДАВОЧНА, ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ АДНА СПРОБА.

НЕ ДУШЫ НА МЯНЕ, СТОКМАН. Я ЗНАЙШОЎ ІХ, ЯК І АБЯЦАЎ, АЛЕ, ВІДАЦЬ, ШТО ТОЙ ФУЗЫ, ЯКОЙ ВЫ МЯНЕ ЗАБЯСПЕЧВАЕЦЕ, НЕДАСТАТКОВА, КАБ ЗЛАДЗІЦЬ З ГЭТЫМІ ДУРНЯМІ.

І ШТО ДАКЛАДНА ВЫ ПРАПАНУЕЦЕ, КАБ ВАШ ТРЭЦІ ЎДАР НЕ АПЫНУЎСЯ АПОШНІМ, М?

УЛІЧВАЮЧЫ, ЯК ГЭТЫЯ ВЫРАДКІ ЗМАГАЮЦЦА, МНЕ НЕАБХОДНА ЦЭЛАЕ ВОЙСКА. НЕВЕРАГОДНА ДОБРАЕ ВОЙСКА.

ЯК ЖА ЦІКАВА АТРЫМЛІВАЕЦЦА, МІСТАР НЯЧЫСЦІК...


пачаць адразу пасля
хто зацікаўлены
нуйце. Эйпрыл
555-4775
ШТО ГЭТА ЗА БРУД У ЦЯБЕ ТУТ, СЯРУН?
ГЭТА НІЧОГА... ГЛУПСТВА. ГЭТА ПРОСТА НУМАР, ПА ЯКОМУ Я ЗБІРАЮСЯ ПАТЭЛЕФАНАВАЦЬ, КАБ МЯНЕ ЎЗЯЛІ НА ПРАЦУ.


ПРАЦУ?! ХА! ТЫ, НАПЭЎНА, ЖАРТУЕШ? ТЫ НЕ ЗМОГ СТРЫМАЦЬ СВАЮ ЎЛАСНУЮ ДУПУ НАВАТ У ГЭТАЙ ДУРНОЙ ХАКЕЙНАЙ КАМАНДЗЕ.


ПРАЦУ-ТРАСЦУ.
ТАК, САПРАЎДЫ...


...ТАБЕ НАОГУЛ АДКУЛЬ ВЕДАЦЬ?


ТУПЫ, НІКЧЭМНЫ АЛКАШ.

ЗНАЧЫЦЬ, ТОЙ ВАЯР, ЯКОГА ЗАБІЛІ – ЁН РАЗМАЎЛЯЎ ПА-ФРАНЦУЗСКУ?
ТАК, МАЙСТАР СПЛІНТАР. І ЁН СПРАБАВАЎ ЗБЕГЦІ АД ГЭТЫХ ДВУХ НІНЗЯ, ВЫКОНВАЮЧЫ РУХІ, ПАДОБНЫЯ НА ПАРКУР.
А ВОСЬ СТЫЛЬ, У ЯКІМ ЁН ЗМАГАЎСЯ... ТАКОГА Я ЯШЧЭ НЕ БАЧЫЎ.
ЯК БЫ ТАМ НІ БЫЛО, МЫ ЗДЗЕЙСНІЛІ ПАМЫЛКУ. ТРЭБА БЫЛО ДАПАМАГЦІ ХЛОПЦУ, ЛЕА. ГЭТЫХ ПАДОНКАЎ БЫЛО ДВА.













МНЕ... МНЕ НЕШТА НАСІЛУ ВЕРЫЦЦА Ў ГЭТА, МАЙСТАР.
ЛЁС? УСЁ НАКАНАВАНА? ГЭТА НЕЙКІ "БОГ З МАШЫНЫ"* АТРЫМЛІВАЕЦЦА.
АДНАК ЦЯЖКА АДМАЎЛЯЦЬ ВІДАВОЧНАЕ, ДАНАТЭЛА.







* "БОГ З МАШЫНЫ" (DEUS EX MACHINA) – ВЫРАЗ, ЯКІ ПАЗНАЧАЕ НЕЧАКАНУЮ, ЗНАРОЧЫСТУЮ РАЗВЯЗКУ ТОЙ ЦІ ІНШАЙ СІТУАЦЫІ, З ПРЫЦЯГНЕННЕМ ВОНКАВАГА ФАКТАРУ, ЯКІ РАНЕЙ НЕ ДЗЕЙНІЧАЎ У ЁЙ, ШТО ЗВЫЧАЙНА РАТУЕ СТАНОВІШЧА, ЯКОЕ ЗДАВАЛАСЯ БЕЗНАДЗЕЙНЫМ. У АНТЫЧНАЙ ТРАГЕДЫІ РАЗВЯЗКА НЕЧАКАНА НАСТАВАЛА, ДЗЯКУЮЧЫ ЎМЯШАННЮ ЯКОГА-НЕБУДЗЬ БОГА, ЯКІ З'ЯЎЛЯЎСЯ НА СЦЭНЕ ПРЫ ДАПАМОЗЕ МЕХАНІЧНАГА ПРЫСТАСАВАННЯ.


"...АДНАК НАВУКА САПРАЎДЫ ЗГУЛЯЛА ВАЖНУЮ РОЛЮ Ў НАШЫМ ВЯРТАННІ."
"УСЁ ПАЧАЛОСЯ, КАЛІ Я ЎПЕРШЫНЮ АЧУЎСЯ Ў ЛАБАРАТОРЫІ."


"АПОШНЯЕ, ШТО Я МОГ УЗГАДАЦЬ, ЯК МЕЧ ПРАНОСІЦЦА НАД МАЁЙ ГАЛАВОЮ І ПРАНІЗВАЕ ШЫЮ..."


"...А ПРАЗ НЕКАТОРЫ ЧАС МЯНЕ ПРАТЫКНУЛІ ЗУСІМ ІНШЫМ МЯЧОМ."
"МЯЧОМ, ЯКІ НЕ ЗАБІЎ МЯНЕ, А НААДВАРОТ, ВЫЗВАЛІЎ."


"ПАКОЛЬКІ ПАСЛЯ ГЭТЫХ ІН'ЕКЦЫЙ МАЯ СВЯДОМАСЦЬ ПАЧАЛА ЎСЁ БОЛЬШ І БОЛЬШ ПАШЫРАЦЦА, Я НАВУЧЫЎСЯ ДУМАЦЬ І НАВАТ АТРЫМАЎ УСПАМІНЫ АБ МАІМ МІНУЛЫМ ЖЫЦЦІ, У ЯКІМ Я БЫЎ ДАЛЁКА НЕ ПАЦУКОМ У КЛЕТЦЫ."


"І, КАЛІ Я ЎБАЧЫЎ ВАС – ЧАЦВЯРЫХ МАЛЕНЬКІХ ЧАРАПАХ, ЯКІЯ БЕЗТУРБОТНА ПОЎЗАЛІ Ў ГЭТЫМ ШКЛЯНЫМ КАНТЭЙНЕРЫ – У ГЛЫБІНІ ДУШЫ Я ВЕДАЎ, ШТО МАЕ МАЛЕННІ БЫЛІ ЎСЛЫХАНЫЯ, І ШТО, НАРЭШЦЕ, НАСУПЕРАК ЗЛАСЛІВЫМ ПАДКОПАМ АРОКУ САКІ..."


"...МЫ ЗНОЎ ЗНАЙШЛІ АДЗІН АДНАГО."


"ТАКСАМА Я ЗРАЗУМЕЎ, ШТО НАШАЕ ЎЗ'ЯДНАННЕ БЫЛО АРГАНІЗАВАНА З ПЭЎНАЙ МЭТАЙ. ВУЧОНЫЯ ПЕРАСЛЕДВАЛІ ЗЛЫЯ НАМЕРЫ – НЕШТА НАКОНТ САКРЭТНАЙ ВАЕНАЙ ПЕРАВАГІ. УСЁ ГЭТА БЫЛО МНЕ ДА БОЛЮ ЗНАЁМА."


"АДНОЙЧЫ Ў ЛАБАРАТОРЫІ З'ЯВІЛАСЯ ПРАЦОЎНІЦА, АД ЯКОЙ ЗЫХОДЗІЛА АЎРА ЗЫЧЛІВАСЦІ І ДОБРАНАМЕРНАСЦІ. Я ЗРАБІЎ УСЁ, ШТО МОГ, КАБ ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЯЕ АБ ХУТКАЙ НЕБЯСПЕЦЫ."


"НЕБЯСПЕЦЫ, ЯКАЯ НЕ ПРЫМУСІЛА СЯБЕ ДОЎГА ЧАКАЦЬ. ПРАЗ НЕКАТОРЫ ЧАС У ЛАБАРАТОРЫЮ ЎВАРВАЛІСЯ НАШЫЯ СТАРЫЯ ВОРАГІ, НІНЗЯ КЛАНА ФУТ..."


...НУ А АСТАТНЯЕ ВЫ ВЕДАЕЦЕ. ЦЯПЕР МЫ СЯМ'Я. СЯМ'Я, ЯКАЯ БЫЛА ЎЗ'ЯДНАНА, ДЗЯКУЮЧЫ І НАВУКОВЫМ, І МІСТЫЧНЫМ ФАКТАРАМ. МЫ ЎЖО ІНШЫЯ, АДНАК УСЁ Ж ТАКІ ГЭТА МЫ.
АЛЕ ЧАМУ МЕНАВІТА ГЭТАК, БАЦЬКА? МЫ ЖА РАНЕЙ БЫЛІ ЛЮДЗЬМІ, ЧАМУ ЗАРАЗ МЫ ВЫГЛЯДАЕМ... ВЫГЛЯДАЕМ ВОСЬ ТАК?


ГЭТАГА Я НЯ ВЕДАЮ, СЫН МОЙ. АЛЕ, УРЭШЦЕ, ВАЖНА, НЕ ТОЕ, ЯК МЫ ВЫГЛЯДАЕМ, А ТОЕ, ШТО ЎНУТРЫ НАС. ЯКОЙ БЫ НІ БЫЛА ПРЫЧЫНА ЎСЯГО ГЭТАГА, Я ЎПЭЎНЕНЫ...

"...ШТО ЎСЁ ГЭТА НЕЗАДАРМА."

ІНТЭРНАТ "НЮ-ЁРК ТЭКА" ЗАЛА Н













...Я ЭЙПРЫЛ.
ВОХ.


ТАКІМ ЧЫНАМ, МІСТАР НЯЧЫСЦІК, КАЖАЦЕ, КАБ ПЕРАМАГЧЫ ПАЦУКА-АДРАЧЭНЦА І ЯГОНЫХ РЭПТЫЛІЙ-ПРАТЭЖЭ, ВАМ НЕАБХОДНА ВОЙСКА?
НУ, КАЛІ ТЫ АБ ГЭТЫМ ХУДЫМ ПАЦУКЕ І ГІДКІХ ЧАРАПАХАХ, ТОЕ ТАК... ВОЙСКА Б НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА.

ЗДАЕЦЦА, ВАМ ПАШЧАСЦІЛА. СТОКГЕН УЖО НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ ЗАЙМАЕЦЦА РАСПРАЦОЎКАЙ У ПЭЎНЫМ СЭНСЕ ВОЙСКА. ВОЙСКА, ЯКОЕ ЗМАГЛО Б ДАПАМАГЦІ ВАМ, НАРЭШЦЕ, ДАМАГЧЫСЯ ПОСПЕХУ Ў ВАШАЙ МІСІІ.

ХАЛЕРА ЯГО...
УРАЖВАЕ, ТАК? МЫ РАСПРАЦОЎВАЛІ ІХ ДЛЯ ПОШУКА І АБЯСШКОДЖВАННЯ С.В.П. НА ПАЛЯХ БІТВАЎ.

С.В.П.?
САМАРОБНЫЯ ВЫБУХНЫЯ ПРЫЛАДЫ.
...


МІНІ-ПАСТКІ, ЯКІЯ ВЫБУХАЮЦЬ.
А. ЗРАЗУМЕЎ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, Я ПАПРАСІЎ ВУЧОНЫХ ПЕРАПРАГРАМАВАЦЬ ІХ У АДПАВЕДНАСЦІ З ВАШЫМ ЗАДАННЕМ.

ШТО ТЫ МАЕШ НА ЎВАЗЕ?

ТАМ БУДЗЕ НЕАБХОДНА НЕЙКАЕ РУЧНОЕ КІРАВАННЕ, АЛЕ НАВАТ ВЫ, З ВАШЫМІ АБМЕЖАВАНЫМІ ЗДОЛЬНАСЦЯМІ, ПАВІННЫ ЗЛАДЗІЦЬ.












ВОСЬ ЧОРТ.


МЕНАВІТА ТАК, МІСТАР НЯЧЫСЦІК...


...ЗАРАЗ МЫ ВЫПУСЦІМ ЧОРЦІКА З ТАБАКЕРКІ.


ГАХ!
SNAP


ШТО ТЫ РОБІШ, СТОКМАН?!
ПРАВЯРАЮ ЯКАСЦЬ ВЫКАНАНАЙ РАБОТЫ, МІСТАР НЯЧЫСЦІК...



Я Ж ПАВІНЕН БЫЦЬ УПЭЎНЕНЫ, ШТО ТВАЁ НОВАЕ ВОЙСКА ПРАЦУЕ
І ТРЭБА ЗАЎВАЖЫЦЬ, У АДРОЗНЕННЕ АД ВАС, ЯНЫ ПАКУЛЬ АПРАЎДВАЮЦЬ МАЕ ЧАКАННІ.
KRRSH


ПРАКЛЁН!


АХХ!
GNNCH
Я ПРОСТА ЖАДАЎ УПЭЎНІЦЦА, ШТО Ў ГЭТЫ РАЗ Я АТРЫМАЎ ТОЕ, ЗА ШТО ПЛАЦІЎ.


ПРЫБЯРЫ АД МЯНЕ ГЭТЫХ ДУРНАВАТЫХ ГАДАЎ!


КАЛІ ЛАСКА.


ГЭТЫЯ "ДУРНАВАТЫЯ ГАДЫ", ЯК ВЫ ІХ НАЗВАЛІ, МАЮЦЬ ІМЯ ЎЛАСНАЕ. ЦАЛКАМ ЯНО ГУЧЫЦЬ ЯК "МІННА-АРТЫЛЕРЫЙНА-ЎТЫЛІТАРНАЯ ЗАРАДЖАЛЬНАЯ АДЗІНКА РОБАТАЎ".

СКАРОЧАНА
Я ЗАВУ ІХ
МАУЗАРАМІ.
ПРАЦЯГ БУДЗЕ!